Источник: **«Звязда» - 2012-11-01**

## Філасофія сякеры і мастака па дрэве




**Іван Супрунчык, разьбяр па дрэве са Століншчыны, — добра вядомы ў Беларусі чалавек, майстар дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Работы таленавітага народнага мастака захоўваюцца ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь, музеі старажытнабеларускай культуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы НАН Беларусі, Брэсцкім абласным краязнаўчым музеі, Столінскім раённым краязнаўчым музеі, Мотальскім музеі народнай творчасці, музеі-сядзібе "Пружанскі палацык", музеі народнага мастацтва Мар'яна Пакропкі ў Атрэмбусах (паблізу Варшавы, у Польшчы). А яшчэ ж — музей у родных Цераблічах, на Століншчыне. Яго яшчэ называюць Цэнтрам драўлянай скульптуры. Немалога пераліку запатрабуюць і згадкі пра ўдзел Івана Піліпавіча ў выстаўках і пленэрах, пра ўзнагароды, якімі адзначаны майстар-інсітнік.**

Відаць, яшчэ адной узнагародай для палешука стала і выданне альбома "Палескія былі ў творах Івана Супрунчыка" (Мінск, "Літаратура і Мастацтва", 2012 год). Фундатары праекта — Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь і Столінскі раённы выканаўчы камітэт. Звычайна на вокладках такіх мастацкіх выданняў не пазначаюць аўтарства. І шкада. Напрыклад, здымаючы з паліцы сваёй хатняй бібліятэкі маскоўскі, 1989 года, альбом "Заір Ісаакавіч Азгур", я ведаю, што яго зрабіў, прыдумаў мастацтвазнаўца Барыс Крэпак. А альбом "Анатоль Мікалаевіч Тычына. Мой Мінск", выдадзены ў 2008 годзе "Белпрынтам", укладзены, выпісаны ці не кожным пяшчотным слоўцам Людмілай Налівайка. А іх імёны — толькі ў выхадных звестках, усё ж не на вокладцы. Вось і альбом "Палескія былі..." і напісаны, і прыдуманы Вольгай Аляксандраўнай Лабачэўскай. Яшчэ некалькі гадоў таму яна (таксама з выдавецтвам "Літаратура і Мастацтва") дала жыццё першаму ў гісторыі айчыннага мастацтвазнаўства асобнаму альбому пра інсітнага, прымітыўнага майстра — "Сялянская энцыклапедыя ў творах Мікалая Тарасюка". Здавалася б, пракладзена новая дарога... Ды толькі больш падобных прац не з'явілася. Ажно да выдання кнігі-альбома пра Івана Супрунчыка.

Несумненна, у Вольгі Аляксандраўны былі памочнікі. Найперш — фотамастак Георгій Ліхтаровіч. Углядаючыся ў зробленыя ім фатаграфічныя выявы работ разьбяра з вёскі Цераблічы, усведамляеш: здымкі твораў мастацтва патрабуюць асабліва чулага зроку. Кіраўнік праекта — Алена Дубойская. Рэцэнзент альбома — доктар мастацтвазнаўства, прафесар Рыгор Фёдаравіч Шаура. Асобна хацелася б назваць Ларысу Быцко. У выхадных звестках яна сціпла пазначана як укладальнік даведачных тэкстаў. А між тым начальнік аддзела традыцыйнай культуры Брэсцкага абласнога грамадска-культурнага цэнтра з поўным правам можа лічыцца першым памочнікам аўтараў тэксту, здымкаў,

выдаўцоў у ажыццяўленні задумы. Рыхтаваць альбом падобнага кшталту, арганізоўваць збор фактаграфічнага і ілюстрацыйнага матэрыялу — справа заўсёды надзвычай складаная. На шчасце, у Вольгі Лабачэўскай у гэтым плане ёсць памочнікі, шчырыя паплечнікі.

І ўсё ж альбом пра майстра-інсітніка, унікальнага палескага разьбяра — сага, праспяваная Івану Супрунчыку таленавітым мастацтвазнаўцам Вольга Лабачэўскай. Асабіста для мяне яе нарыс творчасці, яе прачулае, напоўненае болем ад захопленасці хараством работ разьбяра эсэ падаецца выключна лірычным спевам пра высокае мастацтва.

Раздзелам "У глыбінцы Палесся" і пачынаецца альбом. "Вёску Цераблічы ведаюць у Беларусі і свеце, — піша Вольга Лабачэўская. — Там жыве, там і стварае свае ўнікальныя творы Іван Піліпавіч Супрунчык. Славуты народны майстар, разьбяр па дрэве, мастак. Шмат разоў дэманстраваў ён сваё майстэрства на разнастайных выстаўках, конкурсах, фестывалях, святах. Неаднойчы і я назірала, як, не зважаючы на шумны святочны натоўп навокал і гледачоў, Іван Супрунчык высякае з дрэва скульптуру. Звычайная сялянская сякера ў яго руках здольная на незвычайныя, непаўторныя выявы. Некалькі ашчадных, дакладных зарубак — і дрэва ажывае ў творах, позірках, усмешках і постацях яго драўляных персанажаў. Калі ў цудзе вяртання спілаванаму дрэву жыцця разам з мастаком прымае ўдзел і глядач — гэта заўсёды дакрананне да сакральнай таямніцы творчасці.

Іван Супрунчык — мастак з народа і сапраўдны народны мастак. Журналісты напісалі пра яго безліч артыкулаў. Рэжысёры здымалі кінафільмы. Яго ўклад у беларускую культуру адзначаны спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва. Іван Супрунчык меў нагоду ўручыць асабіста Аляксандру Рыгоравічу Лукашэнку свой падарунак — драўляныя скульптуркі. Тым, хто наведвае Супрунчыка ў Цераблічах, ён абавязкова паказвае падарунак, які атрымаў ад прэзідэнта, — набор адмысловых сякер...".

Палескаму разьбяру пашчасціла: ён здолеў арыгінальна, па-свойму, выявіць у абраным матэрыяле свае мастакоўскія ўражанні ад судакранання сучаснага жыцця з вечнасцю. Пашчасціла і на тое, што талент яго прызнаны, што веданне пра талент прыносіць асалоду многім людзям. Яшчэ і тым, хто пагартае старонкі альбома "Палескія былі ў творах Івана Супрунчыка".

**Сцяпан МІРШЧЫНА**